"Нішто не забытае, ніхто не забыты"

# АНКЕТА

КАМІТЭТ "58" звяртаецца да ўсіх, хто памятае аб сталінскіх злачынствах на Беларусі, да тых, хто пацярпеў сам, да тых, чые блізкія, сябры, знаёмыя сталі ахвярамі сталінскага тэрору. Просім Вас паведаміць па магчымасці поўныя звесткі аб лёсе рэпрэсіраваных ~~/сваіх/?~~/, адказаўшы на ~~наступныя~~ [нашай анкеты] пытанні. Мы будзем удзячныя Вам не толькі за адказы на гэтыя пытанні, але і за ~~усякія~~ [усе] іншыя звесткі, паведамленыя ў любым выглядзе і форме. Мы таксама будзем удзячныя Вам за прапановы па працы і дзейнасці нашага Камітэту.

I Агульныя звесткі аб рэпрэсіраваным:
а/прозвішча, імя, імя па бацьку, б/час і месца нараджэння, в/ нацыянальнасць, г/сацыяльнае паходжанне, д/веравызнанне.

2 II Звесткі на момант арышту, і высылкі/"раскулачвання"/: [адміністрацыйнай „рас]
а/адукацыя, б/прафесія, в/па магчымасці дакладнае месца жыхарства, г/месца працы, д/ пасада, е/ партыйнасць / не толькі у КПСС/.

III Ці былі рэпрэсіраваны члены сям"і ахвяр сталінскага тэрору? /паведаміце па магчымасці анкетныя звесткі па пунктах I і II/, а таксама ступень роднасці/? [сваяцтва]

IУ Звесткі аб рэпрэсіраваным на цяперашні час.
Паведаміце пра яго лёс, калі чалвек быў расстраляны, закатаваны ў час допытаў, памёр у месцах зняволення або высылкі або пасля вызвалення.

калі – „если", „когда"

Паведаміце а/час і месца смерці, б/абставіны і прычыны смерці, в/месца пахавання.

Калі былы рэпрэсіраваны жывы, паведаміце яго цяперашні адрас, нумар хатняга тэлефона, сацыяльнае становішча, памер пенсіі і інш.

У Якая дапамога патрэбна рэпрэсіраванаму / пошук звестак аб родных і блізкіх знаёмых, юрыдычная і сацыяльная дапамога, запіс успамінаў і інш./?

УI Паведаміце паходжанне звестак аб рэпрэсіраваным / з дакументаў, архіваў, перыядычнага друку, ад установаў, прыватных асоб, ад самога рэпрэсіраванага/.

УII Напішыце, хто ведае рэпрэсіраванага асабіста /сябры, знаёмыя, родзічы/.

УIII Калі Вы маеце якія-небудзь дакументы аб рэапрэсіраваных /даведкі аб рэабілітаванні, лісты з месцаў зняволення, фатаздымкі ахвяраў тэрору і яго выканаўцаў, успаміны і іншае/, просім даслаць нам (для музея і архіва мартыралога) арыгіналы або копіі, ці хоць бы паведаміць, якія дакументы Вы маеце.

IX Можа быць Вы /Вашыя сябры, знаёмыя, родзічы/ былі сведкамі або ведаеце сведкаў масавых забойстваў? Ці ведаеце Вы месцы масавых забойстваў, іх выканаўцаў, пахаванні /магілы/ ахвяраў тэрору? Ці ведаеце Вы былыя месцы масавага зняволення на Беларусі незаконна рэпрэсіраваных /турмы, канцлагеры/?

Калі Вы маеце больш падрабязныя звесткі аб рэпрэсаваным, паведаміце дадаткова

X Арышт:

а/дата арышту, б/месца арышту, в/абставіны арышту, г/прычыны арышту.

Калі арыштаў было некалькі, паведаміце аб кожным з іх. Калі чалвек быў "ракулачаны" або адміністрацыйна высланы, паведаміце: а/дату высылкі, б/абставіны высылкі, в/прычыны высылкі.

XI Следства:

а/працягласць следства, б/месца, дзе праводзілася следства, в/следчы орган, г/прозвішчы і званні следчых, д/прад"яўленае абвінавачанне, е/хто яшчэ праходзіў па той жа справе?

XII Суд або замяняючы яго орган і прысуд:

а/працягласць суда, б/месца суда, в/судовы орган, г/ прозвішчы членаў судовага органа, д/прысуд або замяняючае яго рашэнне, е/дата вынясення прысуду, ж/артыкул, з/тэрмін, і/паражэнне ў правах.

Для "раскулачаных" і адміністрацыйна высланых:

а/орган, што прыняў рашэнне аб высылцы, б/асобы, якія праводзілі высылку.

XIII Адбыццё тэрміну:

а-працягласць адбыцця тэрміну, б/месца адбыцця тэрміну, в/род заняткаў, г/лагерны нумар, д/звесткі аб асобах, што адбывалі разам тэрмін.

Для "раскулачаных" і адміністрацыйна высланых:

а/працягласць высылкі, б/месца высылкі, в/род заняткаў, г/звесткі аб асобах, што знаходзіліся разам у высылцы.

XIУ Вызваленне:

а/дата вызвалення, б/прычыны вызвалення /сканчэнне тэрміну, датэрміновае вызваленне і інш./.

ХУ Рэабілітаванне:

Ці хадайнічаў нехта аб рэабілітаванні ~~гэтага чалавека~~ рэпрэсіраванага?

Калі так, то паведаміце: а/дату рэабілітацыі, б/рэабілітуючы орган, в/рэабілітацыйнае вызначэнне /за адсутнасцю складу злачынства ці іншае/, г/нумар даведкі.

Калі ў рэабілітаванні было адмоўлена, паведаміце прычыну адмовы.

Калі жадаеце, паведаміце таксама звесткі і ~~аб сабе~~ пра сябе: прозвішча, імя і імя па бацьку, адрас, нумар тэлефона, адносіны да рэпрэсіраванага /родзіч, сябра, знаёмы, таварыш дзяцінства ~~[illegible]~~ і інш./.

Будзем Вам удзячныя, ~~нават~~ калі Вы зможаце адказаць ~~толькі~~ хоць на ~~невялікую~~ частку пытанняў анкеты. Адказы дасылайце на адвароце анкеты, або на асобных аркушах, захоўваючы парадкавую нумарацыю пунктаў анкеты.

Адказы дасылайце на адрас:

220600, ~~Мінск~~,ГСП, Мінск, вул.Захарава, 19, рэдакцыя газеты "Літаратура і мастацтва", Камітэт "58".

тэлефоны членаў рабочай групы Камітэта:

Камітэт "58".